**Старонкі баявых спраў** // Дзвінская праўда (Верхнядзвінск). – 1964. – 4 ліп. – С. 4.

У краязнаўчым музеі сярэдняй школы № 2 Верхнядзвінска захоўваецца дзённік камандзіра былога атрада імя Леніна Першай Дрысенскай брыгады Сцяпана Дзмітрыевіча Дзеліжонка. Гэты дзённік – дарагая рэліквія слаўных баявых спраў атрада. У дзённіку суровай мовай фактаў расказваецца аб мужнасці, аб подзвігах народных мсціўцаў у гады Вялікай Айчыннай вайны на акупіраванай ворагам тэрыторыі Верхнядзвіншчыны.

***

**25 кастрычніка 1943 года.** Нарада з сярэднім камандным саставам аб падрыхтоўцы да 26-ай гадавіны Вялікага Кастрычніка.

**30 кастрычніка.** Вяртаецца Гаркоўскі – вывеў са строю паравоз і зноў ідзе на заданне.

**31 кастрычніка.** Допыт трох палонных, якіх прывёў Машараў. Паслаў усіх «народнікаў» на падрыў эшалона – няхай крывёю змыюць віну перад Радзімай.

**11 лістапада.** Робім засаду на шасэ, сустракаем чатыры машыны. У выніку бою праціўнік страціў сем забітымі і чатырох раненымі. Захоплены трафеі: кулямёт, партфель з дакументамі, валёнкі, сумка сала. Мініруем мост ля падбітай машыны.

Фашысты, кінуўшы падмацаванне, сабраліся ля спаленай машыны і хацелі спіхнуць яе з моста, каб расчысціць дарогу. Трапілі на міну і страцілі яшчэ 15 чалавек.

**14 лістапада.** Вядзём разведку і дапамагаем насельніцтву вёскі Канюхова пераправіць за раку рэшткі маёмасці і хлеба, каб захаваць ад ворага.

**5 снежня.** Разведка да лініі фронту. Выводзім насельніцтва з акупіраваных раёнаў. Фашысты спалілі жывымі ў вёсцы Пушча 22 чалавекі.

**16 снежня.** Вяртаецца група з разведкі. Выканала заданне. Зрабілі дыверсію. Узарваны дзве падводы, чатыры кані і 13 фрыцаў. На адной падводзе ўзарваліся боепрыпасы.

**23–24–25 снежня.** Рыхтаваліся ў дарогу для манеўравання.

**26 снежня.** Пакінулі раён дзеяння. Ідзе карная экспедыцыя. З крыкам «ура» пайшлі на штурм дзотаў ля вёскі Канюхова. Прарваліся.

**28–29 снежня.** Фарсіравалі раку Дрыса і рухаліся ўжо за чыгункай паміж 17 раз’ездам і Талмачовым.

**29–30 снежня.** Па балотах раніцай 30-га выйшлі за лінію фронту. Сустрэча з Чырвонай Арміяй. Людзі ад стомы і бяссонніцы трацілі прытомнасць, падалі і засыналі – і партызаны, і мірныя жыхары, якія шлі з намі.

**3 студзеня 1944 года.** Атрымаў медаль «Партызан Айчыннай вайны» першай ступені.

**4 студзеня.** Здаю ўсіх у рады Савецкай Арміі. У атрадзе для далейшых дзеянняў пакідаю 160 чалавек.

**7 студзеня.** У наш атрад уліваецца атрад імя Кірава.

**8 студзеня.** Рыхтуемся да рэйду ў варожы тыл. Атрымліваем абутак і абмундзіраванне.

**16 студзеня.** Вечарам развіталіся з салдатамі і пайшлі за лінію фронту.

**30 студзеня.** Адправіў камандзіра аддзялення Смірнова з падрыўнікамі на чыгунку.

**1 лютага.** Група назірання ў саставе трох чалавек у раёне вёскі Кавалі прыняла бой. Вызвалілі мірных жыхароў, якіх фашысты гналі ў няволю. Забіты тры гітлераўцы, адзін ранены. Вызначыўся кулямётчык першага ўзвода тав. Шурыгін.

**2 лютага.** Група разведкі замініравала дарогу ў раёне Канюхова. У выніку бою забіта 11, узята ў палон 7 варожых салдат.

**13 лютага.** Узарвалі мост, знішчылі 700 метраў сувязі, падарвалі аўтамашыну.

**15 лютага.** У раёне калгаса «Зара» таварышы Лісоўскі Л. І. і Гаркоўскі А. П. уступілі ў бой з ворагам. Фашыстаў з паліцаямі было вельмі многа, але гэтыя двое далі бой. Гітлераўцы і паліцаі кінуліся наўцёкі.

**16 лютага.** Разведчыкі падарвалі аўтамашыну і мост.

**4 красавіка.** Група малодшага лейтэнанта Макарскага падарвала дзве аўтамашыны на шасэ Полацк–Себеж.

**5 красавіка.** Ідзе вялікая карная экспедыцыя. Пакідаем лагер.

**6 красавіка.** Спыніліся ў лагеры латышскіх партызан.

**7 красавіка.** Пераходзілі раку Свольну. Спроба прарвацца ў раёне вёскі Калачова скончылася няўдачай. Вярнуліся назад.

**9 красавіка.** З боем прарваліся цераз дарогу, што вядзе на Бярозаўку.

**11 красавіка.** Фашысты спрабавалі акружыць – прарываемся.

**12 красавіка.** Штурмуем бальшак Асвея–Даласцы. Пераходзім у паўночныя лясы.

**22 красавіка.** Дзень нараджэння Леніна. Разграмілі варожы гарнізон у вёсцы Кабыльнікі. Партызанамі атрада забіта 6, ранена 2, узята ў палон 66 фашыстаў. У няроўных баях партызаны атрада праявілі адвагу і гераізм. Не раз даходзіла да рукапашнага бою. Атрад працягвае барацьбу.